ТАТА
«РУЖАВАГА
КВЕТНІКА» 4

ПРА АХВЯРАВАННЕ
І... АХВЯР 13

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

21 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 207 (29829)

# Важкі аўтарытэт мужчыны

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сёння ў Беларусі ўпершыню адзначаецца Дзень бацькі, закліканы падкрэсліць асаблівую значнасць ролі мужчын у выхаванні дзяцей, стварэнні моцнай і шчаслівай сям'і.*

*Падмуркам шматвяковага ўкладу жыцця беларускага народа заўсёды былі традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, дзе бацька — галава і апора для ўсяго роду, крыніца назапашанага ў пакаленнях досведу, сілы і мудрасці продкаў.*

*У сучасным свеце менавіта асабісты прыклад, клопат і падтрымка бацькі з дзяцінства выхоўваюць адказнасць, працавітасць, павагу да старэйшых, гатоўнасць служыць Радзіме і абараняць сваю зямлю.*

*Перакананы, новае свята ўмацуе аўтарытэт бацькоўства ў грамадстве і народзе з Днём маці стане адной з любімых сямейных урачыстасцяў.*

*Няхай у нас, мужчын, заўсёды хапае сіл на ўзорнае выкананне бацькоўскага абавязку дзеля будучыні дзяцей і працвітання любімай Беларусі.*

*Ад усёй душы жадаю вам і вашым блізкім моцнага здароўя, дабра, міру і дабрабыту.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Фота БелТА.

Уладзіслаў ТРЫКОЗА з Мінска — бацька вялікай сям'і — разам з жонкай Юліяй выхоўвае сына і дзвюх дачушак. А яшчэ ён гаспадар вялікага дома і падпалкоўнік. Для сваёй сям'і, як і належыць мужчыну, — падтрымка і апора. Дарэчы, нядаўна сям'я Трыкозаў прадстаўляла сталіцу на фінале конкурсу «Сям'я года».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «РАЗАМ, ТАЛАКОЙ, МОЖНА ПЕРААДОЛЕЦЬ ЛЮБЫЯ ПЕРАШКОДЫ, ЗНАЙСЦІ ВЫЙСЦЕ З САМАЙ СКЛАДАНАЙ СІТУАЦЫІ»

Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях фарміравання Усебеларускага народнага сходу і змянення выбарчага заканадаўства. Разам з экспертамі па заканатворчай дзейнасці кіраўнік дзяржавы абмеркаваў шэраг прынцыпова новых напрацовак. Аднак перш чым распачаць размову па заканадаўчых навацыях, беларускі лідар закрануў такія важныя пытанні, як заканчэнне ўборачных работ і цэнаўтварэнне.**

## «Не хочаце ваяваць са зброяй, змагайцеся ў полі»

«Я папярэдзіў урад, гэта перш за ўсё задачы губернатараў, якія яны павінны вырашаць, уборачная кампанія ў нас скончыцца, калі апошні плуг сыдзе з поля і вы падымеце зябліва на 100 %, — звярнуўся да прысутных Прэзідэнт. — І папярэджваю ўсіх губернатараў ад спроб штосьці там у статыстыцы не тое што прыхарашыць — з адной графы перанесці ў іншую. Тут у вас нічога не атрымаецца».

Кіраўніком дзяржавы пастаўлена канкрэтная задача — узараць зяблівa, завяршыць уборку ўраджаю. Асабліва добрасумленна аднесціся да даручэння Аляксандр Лукашэнка папрасіў кіраўніцтва Гомельскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Пры гэтым папярэдзіў, што калі задачы будуць нявыкананыя, спытае вельмі жорстка. ***«Скажу коратка: не хочаце ваяваць са зброяй — змагайцеся ў полі, на заводзе і фабрыцы,*** — кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму з яго боку ідзе такі ціск і патрабаванне. — ***Наша вайна праходзіць не праз Украіну, а праз эканоміку, праз нас. Таму страсяніцеся, яшчэ раз паўтараю».***

СТАР. 2–3

## КАРОТКА

- **У Беларусі будзе ўсталяваны адзіны парадак калькуляцыі сабекошту прадукцыі.**
- У краіне 24 кастрычніка пачнецца адпраўка прызыўнікоў на тэрміновую ваенную службу.
- **Беларускія НПЗ пачынаюць выпускаць палепшаны від зімовага дызпаліва.**

ISSN 1990 — 763X

Актуальна

# «МЫ НЕ ЧАКАЕМ ШОКАЎ У РАБОЦЕ ЎНУТРАНАГА РЫНКУ»

## Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей Багданаў пракаментаваў пастанову ўрада № 713, дзе акрэслена новая сістэма рэгулявання цэн

**Гэта пастанова прынята ў развіццё Дырэктывы № 10 у мэтах абароны інтарэсаў грамадзян. «Сутнасць дакумента — спыніць рост цэн, інакш кажучы, выбудавана сістэма рэгулявання цэн па ўсім ланцужку — ад вытворцы да прылаўка», — сказаў Аляксей Багданаў. Паводле яго слоў, дакумент распрацаваны і прыняты на падставе тых даных, якія былі прапанаваны рабочай групай, створанай па даручэнні кіраўніка дзяржавы.**

«Рэгуляванне паводле гэтага дакумента распаўсюджваецца на 370 таварных груп. Практычна на ўвесь спажывецкі кошык, які ахоплівае больш за 90 % тавараў, якія набываюцца насельніцтвам нашай краіны. За выключэннем лекаў, паліва, алкаголю і тытуню. Гэтыя тавары рэгулююцца іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, і сюды іх уключаць не было ніякага сэнсу», — дадаў міністр.

## Не парушаючы эканамічны рост

Аляксей Багданаў адзначыў, што дзяржава сапраўды ўводзіць кантроль над цэнаўтварэннем, але і раней гэтая практыка існавала ў краіне. У розных элементах яна стрымлівала рост цэн. «Сёння мы проста распаўсюдзілі гэтую сістэму кантролю на больш шырокі пералік тавараў. У той жа час, у выпадку неабходнасці пакінулі магчымым рост цэн у каго-небудзь з вытворцаў. Для гэтага вытворцам тавараў неабходна звярнуцца ў адпаведны орган з нармальным эканамічным абгрунтаваннем». Міністр запэўніў, што ніхто не будзе стрымліваць эканамічны рост таго ці іншага прадпрыемства.

«У нас няма задачы спыніць эканамічную актыўнасць краіны. Наадварот, яе неабходна развіваць і ўзмацняць. Натуральна, такую актыўнасць трэба стымуляваць, але варта задумацца над пытаннем зніжэння выдаткаў». Аляксей Багданаў лічыць, што гэта сур'ёзнае пытанне, якое само жыццё ставіць перад намі, бо сітуацыя ў свеце вельмі заблытаная, у многіх краінах вялікія ўзроўні інфляцыі.

СТАР. 3

# «РАЗАМ, ТАЛАКОЙ, МОЖНА ПЕРААДОЛЕЦЬ ЛЮБЫЯ ПЕРАШКОДЫ, ЗНАЙСЦІ ВЫЙСЦЕ З САМАЙ СКЛАДАНАЙ СІТУАЦЫІ»

## «У аснове павінна быць справядлівасць»

Другое пытанне, на якое звярнуў увагу беларускі лідар, — цэнаўтварэнне. У пачатку месяца ўраду і ўсім зацікаўленым асобам была пастаўлена задача па выпрацоўцы мер кантролю і рэгулявання цэн. «Што датычыцца замарозкі цэн, гаворка ішла да 20 кастрычніка або да таго часу, пакуль не ўступіць у сілу пастанаўленне ўрада, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — ***Ніякай гаворкі аб татальнай, назаўсёды, замарозцы цэн не ішло. Гаворка ішла аб тым, што назапасілі вось столькі «тлушчу». Гэта датычыцца ўсіх: і бізнесменаў, прадпрымальнікаў, і кіраўнікоў дзяржаўных формаў уласнасці».***

Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб усплёску інфляцыі ў пачатку года. Аднак гэта быў не часовы рост цэн, як многія палічылі. У выніку інфляцыя павялічылася ўдвая. «14 % — рост цэн. Што яшчэ трэба? — задаў пытанне беларускі лідар. — Як чалавек зямны, я гэта цудоўна ўсё разумею, і маё рашэнне да 20 кастрычніка — не чапаць цэны — было прадуманым і абгрунтаваным. Скажыце, хто зваліўся да сённяшняга дня? Ніхто не зваліўся. Сёй-той спалохаўся, бо больш на цэнах сваё багацце ствараць не будзе. Датычыцца ўсіх вытворцаў, аптавікоў і рознічнага гандлю. Усіх! Аднак гэта не значыць, што цэны спынены і заўтра яны расці не будуць».

Ёсць група тавараў — і аб гэтым кажа Прэзідэнт, — якія мы набываем у іншых краінах, таму рост цэн на іх ад нас не залежыць. У прыватнасці, гаворка ідзе аб бананах, каве. «Мы іх закупляем, але для нас гэта невялікі страх, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — ***Хто любіць каву, піце, калі ласка. Калі кава падаражэла — ну, прабачце. Я магу прапанаваць малако, гарбату.*** Я кавы не п'ю — і жывы-здаровы».

У тым жа кантэксце і прыклад з тытунём. Хто хоча курыць, той павінен разумець, што гэта таксама немалыя выдаткі. Пры гэтым, як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, рост цэн на імпарт таксама будзе кантралюемым. ***«Ніякіх бонусаў у гандлі на імпарт увогуле быць не можа,*** — падкрэсліў Прэзідэнт. — ***Ні на імпарт, ні на нашы тавары ніякіх бонусаў быць не павінна. У аснову канцэпцыі кантролю і рэгулявання цэн (рэгуляваць можна і трэба) павінна быць пакладзена справядлівасць. У эканоміцы такога паняцця няма, аднак у жыцці людзей справядлівасць заўсёды павінна прысутнічаць.*** Калі хочаце быць багацейшымі, скарачайце сабекошт. Аднак мусіць быць справядліва!»

У гэтай сувязі красамоўны прыклад, які прывёў кіраўнік дзяржавы. Некаторыя багацеі, стварыўшы ў Беларусі пэўную гандлёвую сетку, атрымліваюць у месяц па 207, 210, 270 тысяч рублёў, седзячы пры гэтым у Італіі або Варшаве. У той жа час кантралёр-касір у яго краме атрымлівае па 600 — 700 рублёў. «Гэта ўвогуле недапушчальна! — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Што гэта за грошы — 600 рублёў? А прадаўцы колькі атрымліваюць? Ад 700 да тысячы рублёў? Якія могуць быць размовы? Дзе справядлівасць? Чаму такая разбежка? Калі сярэдні заробак на заводзе — тысяча долараў, кіраўнік не можа атрымліваць больш за шэсць тысяч. Ладна, у шэсць разоў ад сярэдняга заробку, а тут жа ў 200 разоў! У аснове павінна быць справядлівасць».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што, кантралюючы працэс цэнаўтварэння, не трэба хадзіць натоўпамі па крамах. «Трэба выпрацаваць сістэму, — лічыць ён. — Адзін раз у краму зайшоў, паглядзеў, падалося вам, што цана вырасла, прасіце накладную і разбірайцеся. А калі трэба дзесьці павысіць цану — гэта выключны выпадак — давайце павысім». Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што калі тыя ж губернатары вырашаць, што цэны патрэбна зрушыць, няхай рухаюць: кіраўнік дзяржавы будзе ведаць, хто за такое рашэнне нясе адказнасць.

«Не дай бог зноў нейкая там вайна або заварушка, або яшчэ нешта здарыцца, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Я бачу жудасны ціск на вас перш за ўсё, але ўжо і на мяне пачалі выходзіць — ах, на паўзу эканоміку паставілі. Якая эканоміка на паўзе пастаўлена? Дакладна ўсё павінна быць. Ты прыйшоў у гандаль працаваць — працуй, вітаю. Мы табе дапамагаем: зямлю далі, крэдыты, каб пабудаваць прадпрыемства. Ты ўзяў людзей і прыняў на работу — ты за іх перш за ўсё адказваеш. Калі ласка, працуй. Правілы такія».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт згадаў, як некаторы час, няхай і на грамадскай рабоце, працаваў з прадстаўнікамі сферы гандлю. «Гэта вельмі акуратныя людзі былі, — заўважыў ён. — Я ім сказаў так — значыць будзе так: як банкіры — ні ўлева, ні ўправа. І калі там дрэнна, значыць мы іх распусцілі, значыць там няправільныя каманды».

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў: гаворка ідзе не аб тым, каб замарозіць цэны, а аб тым, каб узяць працэс цэнаўтварэння на кантроль. Прэзідэнт не супраць, каб стваралiся новыя тавары. Толькі новыя — з новымі спажывецкімі якасцямі. Каб не было, як з падзеленай курыцай, якая прадаецца ўдвая даражэй, чым цэлая. «А то, бачыце, завялі — не тое рашэнне прынята, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Адступленне быць не можа. Не дай бог, будзе прынята нейкае куртатае, незразумелае, спусціўшы рукавы, рашэнне».

## «Менш бедламу, больш арганізаванасці»

Вярнуўшыся да пытання завяршэння ўборкі ўраджаю, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што канчаткова трэба мабілізавацца. Прэзідэнт абурыўся, калі даведаўся, што на некаторых сельскагаспадарчых прадпрыемствах выхадныя з сярэдзіны пятніцы да сярэдзіны панядзелка. «Азімыя недасеяны, а ў іх выхадны, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Зімой будзем адпачываць. Вось адсюль — цэны. Ад бедламу, які заганяе кошт тавару, і цэны растуць шалёна. Менш будзе бедламу, больш арганізаванасці — больш будзе толку».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што некаторыя ўжо сталі разважаць, што збожжа хапае, трэба грубых кармоў паболей, сакавітых, травяністых. «Правільны падыход, — пагаджаецца Аляксандр Лукашэнка. — Дык гэта вы толькі на 50 % арганізавалiся. Дабаўце яшчэ 50, і мы перастанем дацiраваць сельскую гаспадарку. ***Якія санкцыі? Якія ў Беларусі санкцыі? Што нам перашкаджае сёння працаваць? Назавіце хоць адзін тавар, які мы не можам прадаць?*** Расія ўсё паглыне. За выключэннем дзвюх-трох пазіцый. Ну дык гэтыя дзве-тры пазіцыі вазьміце пад кантроль. Усё астатняе прадаецца са свістам, па экспарце цэны шалёныя. Аднак не забывайце, мы павінны накарміць сваіх дзесяць мільёнаў і два мільёны гасцей, якія да нас прыязджаюць».

Зыходзячы з гэтага Прэзідэнт расказаў, што расійскія вайскоўцы, якія знаходзяцца ў нашай краіне, у захапленні, як іх прынялі ў Беларусі: пасялілі, накармілі, дапамагаюць, навучаюць. «Так павінна быць усюды, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Лёс наш такі. Іншы варыянт — вайна. Рабіце добрасумленна сваю справу, усё астатняе — маё. І мы ніколі ваяваць не будзем».

## «УНС — гэта апора і для народа, і для ўлады»

Вяртаючыся да тэматыкі нарады, кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў лютым бягучага года адбыўся рэферэндум. На ім народ вызначыў шляхі далейшага развіцця беларускай дзяржавы. «Для нас з вамі гэта — фундаментальныя, стратэгічныя напрамкі, па якіх неабходна працаваць. ***Рашэнне пастаўленых задач патрабуе пабудовы належнай прававой асновы»,*** — заўважыў Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў першую чаргу трэба вызначыць парадак фарміравання і дзейнасці новага органа ўлады — Усебеларускага народ-

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## У тэму

### Святлана ЛЮБЕЦКАЯ: «Гэта дасягненне народнай згоды»

Пасля нарады з Прэзідэнтам старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Святлана Любецкая расказала журналістам, што поўных аналагаў такога інстытута, як Усебеларускі народны сход, у міжнародній практыцы няма. «Ёсць элементы, якія мы аналізавалі і якія выкарыстоўваліся пры фарміраванні законапраекта, як наогул адбываецца заканатворчасць, але тое, як сёння фармалізаваны палажэнні адносна Усебеларускага народнага сходу, — гэта нашы напрацоўкі, — падкрэсліла парламентарый. — Таму пытанне фарміравання Усебеларускага народнага сходу таксама абумоўлена тымі пасыламі, якія былі закладзены яшчэ ў абноўленай Канстытуцыі. Гэта дасягненне народнай згоды, гэта дэмакратычнасць усіх органаў, у тым ліку вышэйшых прадстаўнічых, для таго каб прымаць стратэгічна важныя рашэнні».

У Канстытуцыі вызначана гранічная колькасць УНС — 1200 дэлегатаў. Мяркуецца, што гэта будуць прадстаўнікі розных сфер: тыя, хто працуе ў выканаўчай уладзе, дэпутаты мясцовых Саветаў, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці. «Таму і была задача распрацаваць законапраект «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», каб было зразумела, хто гэтыя суб'екты, як яны будуць дзейнічаць, у тым ліку ў мэтах стварэння УНС. Такі прыярытэтны прынцып фарміравання агульнага складу УНС будзе накіраваны на ўлік інтарэсаў розных слаёў насельніцтва», — растлумачыла яна. Згодна з праектам Закона «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», правам выбрання дэлегатаў будуць валодаць рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні з колькасцю не менш як 100 тысяч чалавек. Сёння пад такія крытэры трапляюць ФПБ, ветэранская арганізацыя, РГА «Белая Русь», БРСМ і Беларускі саюз жанчын.

### Валерый МІЦКЕВІЧ: «УНС — найвышэйшы орган народнага прадстаўніцтва»

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый Міцкевіч расказаў, што прапанаваныя пазіцыі Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе» былі падтрыманы Прэзідэнтам. «У нас ёсць поўнае разуменне, у якім напрамку мы рухаемся, — паведаміў ён. — У Канстытуцыі дакладна прапісаны ўсе асноўныя паўнамоцтвы Усебеларускага народнага сходу. Нормы Канстытуцыі дазваляюць надзяліць сход іншымі паўнамоцтвамі. У законе вызначаны паўнамоцтвы прэзідыума, гэта рабочы орган сходу, які будзе функцыянаваць у перапынках паміж сходамі. У законе прапісана, што будзе створаны сакратарыят Усебеларускага народнага сходу, які будзе забяспечваць тэхнічную падтрымку работы сходу. Усебеларускі народны сход — гэта вышэйшы орган народнага прадстаўніцтва, і, адпаведна, у Канстытуцыі ён мае найважнейшае месца. Ён будзе зацвярджаць стратэгічныя напрамкі развіцця нашай краіны і таксама выконваць функцыі стабілізацыйнага органа».

У адпаведнасці з нормамі Канстытуцыі, Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе» павінен быць прыняты да 15 сакавіка 2023 года. «Прэзідэнт даручыў абмеркаваць гэты праект закона з максімальна шырокімі слаямі насельніцтва, у працоўных калектывах, з грамадскімі аб'яднаннямі, для таго, каб атрымаць зваротную сувязь», — падзяліўся Валерый Міцкевіч.

***

Аб удасканаленні выбарчага заканадаўства расказаў **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі Ігар КАРПЕНКА.** Па яго словах, у цэлым канцэптуальна змяненні ў выбарчае заканадаўства Прэзідэнтам былі падтрыманы. «Яшчэ будзе працаваць дэпутацкі корпус, хоць ён ужо падключаўся на этапе распрацоўкі законапраекта «Аб змяненнях і дапаўненнях у Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь», — удакладніў Ігар Карпенка. — Я думаю, што сумесна з дэпутатамі мы правядзём выязныя пасяджэнні профільных камісій і шэраг дыялогавых пляцовак, хоць гэта мы ўжо часткова рабілі. Сёння было даручана правесці абмеркаванне з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, палітычных партый. Мы гатовы ў гэтым плане папрацаваць».

Гаворачы аб рабоце над Выбарчым кодэксам, старшыня ЦВК вызначыў тры прынцыповыя пазіцыі. Па-першае, кодэкс прыводзіцца ў адпаведнасць з унесенымі змяненнямі ў Канстытуцыю. У прыватнасці, даецца права ўдзельнічаць у выбарах грамадзянам, якія знаходзяцца пад следствам, але пры гэтым у адносінах да іх яшчэ не вынесены прыгавор суда. Акрамя таго, у абноўленым кодэксе да кандыдатаў у прэзідэнты і дэпутаты будзе прад'яўляцца шэраг новых патрабаванняў. Па-другое, Выбарчы кодэкс, які дзейнічае на дадзены момант, суадносіцца з тымі навацыямі ў заканадаўстве, якія сёння паралельна ідуць або ўжо прыняты ў заканадаўчых актах. Па-трэцяе, змяненні звязаны з аналізам практыкі выбарчых працэсаў у Рэспубліцы Беларусь, а таксама за яе межамі.

«Калі ў адзіны дзень галасавання будуць праходзіць выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў усіх мясцовых Саветаў у адзін дзень, у прыватнасці 25 лютага 2024 года, трэба стварыць і пэўныя прававыя нормы, якія дазволілі б і камісіям працаваць якасна, — звярнуў увагу Ігар Карпенка. — Напрыклад, на мясцовых Саветах у нас няма парога яўкі выбаршчыкаў. Гэта значыць, колькі прыйшло на выбарчыя ўчасткі, прыняло ўдзел у галасаванні — ад гэтай колькасці і абралі дэпутатаў. На парламенцкіх выбарах у нас ёсць парог яўкі. Мы прапаноўваем гэты парог яўкі зняць, а значыць, выраўняць усе выбары для таго, каб і камісіям было прасцей працаваць, і суб'ектам, якія непасрэдна арганізуюць усю гэтую дзейнасць».

Яшчэ адна навацыя прапануецца ў адносінах да акрэдытацыі назіральнікаў. Цяпер назіральнік можа прыйсці і акрэдытавацца для назірання на выбарах нават у дзень галасавання. Гэта не зусім справядліва. «Калі цябе мэтанакіравана вылучае якая-небудзь арганізацыя, або грамадзяне, або працоўны калектыў назіраць за выбарамі або рэферэндумам, значыць, паклапаціся загадзя — прыйдзі, акрэдытуйся ў камісіі, азнаёмся, дзе будзе праходзіць галасаванне, пазнаёмся з членамі камісіі», — патлумачыў суднасць прапанаванага новаўвядзення Ігар Карпенка.

нага сходу, скарэкціраваць выбарчае заканадаўства. Адпаведныя законапраекты ўжо падрыхтаваныя, але, як дакладваюць Прэзідэнту, асобныя іх палажэнні выклікалі сур'ёзныя дыскусіі. Удзельнікі нарады абмеркавалі шэраг прынцыпова новых напрацовак.

Пачалі з праекта аб Усебеларускім народным сходзе. Прэзідэнт нагадаў, што дадзены закон неабходна прыняць не пазней за сакавік 2023 года. Ён акцэнтаваў увагу, што часу на разварушванне няма. ***«УНС павінна аб'яднаць дзелегатаў ад усіх рэгіёнаў і пластоў насельніцтва, прадстаўнікоў улады і нашага грамадства. Разам, талакой, можна пераадолець любыя перашкоды, знайсці выйсце з самай складанай сітуацыі. Пры гэтым хачу падкрэсліць, што дзелегаты УНС працуюць на грамадскіх пачатках. Людзі там не задзейнічаныя як дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на пастаяннай аснове. Гэта іх не асноўная работа. Таму не трэба лямантаваць і крычаць, што мы будзем велізарныя грошы выдаткоўваць на УНС»,*** — адзначыў беларускі лідар.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Усебеларускі народны сход — гэта апора і для народа, і для ўлады. Таму важна, каб непасрэдна людзі прымалі рашэнні, на якія потым будуць абапірацца дзяржаўныя органы. «Гэта значыць, нам будзе прасцей працаваць, калі гэтая талака (там 1200 ці колькі чалавек) збярэцца, прадстаўнікі адтуль, знізу, якія бачаць цэны ў крамах, якія гайкі круцяць і хлеб сеюць, і прымуць рашэнне, у якім кірунку рухацца», — растлумачыў ён.

Прэзідэнт упэўнены, што ва Усебеларускага народнага сходу павінны быць не толькі вызначаныя Канстытуцыяй паўнамоцтвы, але і іншыя. Асноўны Закон тое дазваляе. Прынамсі, не забараняе. «Гэта не значыць, што мы павінны пашырацца і Усебеларускі народны сход будзе не толькі перасякаць нейкія паўнамоцтвы Прэзідэнта, парламента, судовай улады і яшчэ горш — будзе перашкаджаць ім працаваць. Гэтага не павінна быць. УНС павінен займацца сваімі пытаннямі, тымі, якія не будуць уваходзіць у кампетэнцыю органаў улады. Ён наверсе, як народнае вечА. Абмеркавалі, прынялі рашэнне па пэўных пытаннях, па пэўных пытаннях парэкамендавалі, пакрытыкавалі і разышліся. Усе астатнія, як і сёння, вырашаюць свае штодзённыя пытанні», — патлумачыў ён.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу забяспечыць бесперапынную працаздольнасць Сходу без стварэння грувасткага адміністрацыйнага апарату. «Гэтага ні ў якім разе не будзе, я гарантую», — патлумачыў ён.

## «Выбары 2024 года трэба правесці па новых правілах»

Па словах Прэзідэнта, у Законе аб УНС варта раскласці па палічках многія пытанні: кампетэнцыю, механізм утварэння органа, як будзе выбірацца склад дзелегатаў, патрабаванні, якія да іх прад'яўляюцца. У сваю чаргу, парадак абрання дзелегатаў будзе дэталёва прапісаны ў Выбарчым кодэксе. «Да абнаўлення Выбарчага кодэкса мы абавязаныя падысці сістэмна і правільна. Гэта найважнейшы заканадаўчы акт, паводле якога ажыццяўляюцца электаральныя працэсы ў краіне, пачынаючы ад рэспубліканскіх рэферэндумаў, заканчваючы сельскімі Саветамі. У дадзеным дакуменце ўсё павінна быць зразумела і для выбаршчыкаў, і для членаў камісій», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што патрэба ў змяненні Кодэкса паспявала паступова, на працягу некалькіх гадоў. Але сёння само жыццё прымушае аператыўна працаваць і паскарацца.

***«Выбары, якія адбудуцца ў 2024 годзе, мы павінны правесці ўжо па новых правілах. Засталося крыху больш за год. Гэта будзе самая маштабная кампанія за апошнія гады»,*** — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Таму на працягу кароткага часу неабходна абраць дэпутатаў усіх узроўняў, сфарміраваць склад Савета Рэспублікі, вылучыць дэлегатаў УНС.

Прэзідэнт папярэдзіў, што лёгкіх выбарчых кампаній чакаць не даводзіцца: «Самі бачыце, у якіх умовах знаходзіцца наша краіна. Нявызначанасць міжнароднай абстаноўкі, беспрэцэдэнтны знешні ціск, інфармацыйныя атакі і правакацыі. Ды яшчэ своечасова ўбіраць, араць не жадаем і цэны кантраляваць, каб людзі бачылі, што мы дзяржава для народа. Дык давайце будзем для народа».

Беларускі лідар акрэсліў асноўныя пытанні: чаго не хапае ў дзеяным плане, ці гатовыя да работы па новых правілах. І вельмі важнае пытанне — ці дастаткова мер, якія дазваляюць супрацьдзейнічаць спробам дэзарганізацыі выбараў? На словах Аляксандра Лукашэнкі, да гэтага рыхтуюцца, і рыхтуюцца ўжо не проста «выйсці ў кароткіх спаднічках кветачкамі памахаць».

***«Я даручыў сілавікам праінфармаваць народ, што адбываецца. Гэта вельмі важная праблема. Усе: «Вось гэта праблема, Лукашэнка народ запалохаць хоча». Ды наадварот, я не хачу, каб вы запалохваліся. Я хачу, каб народу данеслі ўсё тое, што адбываецца, амаль на сто працэнтаў адкрыта. А народ потым няхай прымае рашэнне. Калі за два гады не пераканаліся, што з намі хацелі і хочуць зрабіць — прымайце рашэнні. Хочаце праз бяду прайсці — калі ласка, сцяг у рукі, ідзіце. Жадаеце, каб было ціха і спакойна, каб увечары і раніцай у душ схадзіць, каб дзетак выкупаць у цёплай вадзе, каб цяпло ў доме было, каб газ, нафта і іншае было, каб было што паесці, апрануцца ў нешта, калі вы гэтага хочаце — зубы сціснулі і наперад. Рабіце тое, што я вам кажу».*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## «Гэта наш унікальны прававы вопыт»

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ЦВК прапануе істотнае скарачэнне колькасці акруговых выбарчых камісій. На яго думку, наўрад ці тое кагосьці перагрузіць. Але дадзенае пытанне таксама было вынесенае на абмеркаванне. Прэзідэнт прапанаваў паглядзець на выбары за мяжой, разабрацца ў іншых праблемах.

Аб рабоце над законапраектам «Аб Усебеларускім народным сходзе» далажыла Святлана Любецкая, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве. Яна падкрэсліла, што згаданы законапраект з'яўляецца спецыфічным па сваёй сутнасці. «Аналагаў прававога рэгулявання парадку фарміравання і дзейнасці найвышэйшага прадстаўнічага органа, якім з'яўляецца УНС, у міжнародная практыцы няма. Прапанаванае заканадаўчае замацаванне інстытута УНС — гэта наш нацыянальны ўнікальны прававы вопыт, які мае пры гэтым гістарычны правобраз», — адзначыла парламентарый.

«І аб'ёзджаны гадамі. Гэта наша, і мы гэта выпрабавалі дзесяцігоддзямі з 1996 года», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Святлана Любецкая расказала, што пры падрыхтоўцы законапраекта з улікам гістарычнай і заканадаўчай базы вырашаліся тры асноўныя задачы. Першая — замацаваць такі механізм фарміравання УНС, які, з аднаго боку, забяспечваў бы аўтарытэт, прафесіяналізм і эфектыўнасць работы дзелегатаў, з другога — легітымнасць сходу. Гэта значыць прызнанне грамадствам прымаемых сходам рашэнняў за кошт прадстаўніцтва дзелегатаў — ад усіх галін улады, ад мясцовых Саветаў дэпутатаў і ад грамадзянскай супольнасці. «Пры гэтым парадак абрання дзелегатаў ад мясцовых Саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці павінен быць максімальна просты, выключыць складаныя шматступеньчатыя працэдуры, каб лішні раз не далучаць ЦВК і суды ў разглядзе скаргаў. Яшчэ на стадыі работы Канстытуцыйнай камісіі быў вызначаны падыход — не ператвараць фарміраванне УНС у яшчэ адну электаральную кампанію», — расказала Святлана Любецкая.

Другая задача — вызначыць парадак рэалізацыі канкрэтных канстытуцыйных паўнамоцтваў УНС, вызначыўшы менавіта ў законе ўстанаўленне лёсавызначальных для краіны рашэнняў, пачынаючы ад ініцыявання правядзення рэспубліканскіх рэферэндумаў і да аб'яўлення і ўвядзення надзвычайнага або ваеннага становішча.

Трэцяя задача — сфарміраваць кампактную структуру УНС, дакладна вызначыць паўнамоцтвы старшыні, функцыі прэзідыума, каб яны не перасякаліся з кампетэнцыяй сходу і не падмянялі яго.

«У выніку з улікам надзялення сходу стратэгічна важнымі ў сённяшнім няпростым становішчы паўнамоцтвамі ключавым і самым абмяркоўваемым з'яўлялася пытанне фарміравання УНС», — падкрэсліла парламентарый.

**Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.**

# «МЫ НЕ ЧАКАЕМ ШОКАЎ У РАБОЦЕ ЎНУТРАНАГА РЫНКУ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Словы аб зніжэнні выдаткаў не проста лозунг, лічыць міністр. Міністэрства ўжо сёння атрымлівае інфармацыю ад гандлёвых арганізацый аб тым, што многія вытворцы (мясны і малочны напрамкі, прадпрыемствы хлебабулачных вырабаў) знізілі цэны на свае тавары.

## Стоп цане без кантролю

Асобна спыніўся Аляксей Багданаў на двух раздзелах новай сістэмы рэгулявання цэн: айчынныя вытворцы і тавары імпартнага вырабу.

Што мы маем па таварах мясцовага вырабу? «З сённяшняга дня любое павышэнне адпускных цэн вытворцаў падлягае ўзгадненню з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам (у залежнасці ад месца рэгістрацыі юрыдычнай асобы) альбо з рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, калі арганізацыя, якая выпускае прадукцыю, уваходзіць у яго склад або знаходзіцца ў падпарадкаванні, альбо з Белкаапсаюзам, калі арганізацыя ўваходзіць у сістэму спажывецкай кааперацыі», — сказаў Аляксей Багданаў.

У асобных выпадках, па яго словах, узгадненне не патрабуецца. Напрыклад, заканчэнне тэрмінаў правядзення мерапрыемстваў па прасоўванні тавару — акцыі, зніжкі, распродажы, па якіх былі заключаны адпаведныя дагаворы з рознічнымі гандлёвымі аператарамі. Таксама пры заключэнні дагавораў пастаўкі з новымі контрагентамі або пры змене ўмоў пастаўкі з дзеючымі контрагентамі, але не вышэй за адпускныя цэны, вызначаныя ў прэйскурантах пастаўшчыкоў або ў палажэннях аб зніжках на дату ўступлення ў сілу гэтай пастановы на дату 20 кастрычніка.

«Самі вытворцы могуць змяняць цану без узгаднення з адпаведнымі органамі ў выпадку павышэння цэн або тарыфаў, якія рэгулююцца дзяржавай. Напрыклад, паліва, энергетыка і іншыя. Акрамя таго, у выпадку павышэння падаткаў або абавязковых плацяжоў, якія ўваходзяць у сабекошт вырабленай прадукцыі, прапарцыянальна іх росту і ўдзельнай вазе ў сабекошце», — адзначыў міністр.

Узгадненне з дзяржорганамі аб павышэнні цаны выконваецца ў тэрмін не больш за дзесяць рабочых дзён з даты паступлення дакументаў, а ў выпадку, калі тавар хутка псуецца (яго тэрмін прыдатнасці — не больш за 30 дзён), — не больш за пяць рабочых дзён.

## Прымусіць працаваць з імпартам без максімальных накрутак

Міністр адзначыў, што, паводле пастановы № 713, таксама ўводзіцца рэгуляванне цэн на імпартаваныя спажывецкія тавары шляхам устанаўлення дыферэнцыраваных гранічных максімальных надбавак для імпарцёраў. «Калі раней гэтых надбавак у імпарцёраў не было і можна было 200—300 % накруціць, сёння гэтая сітуацыя будзе выключана», — звярнуў увагу Аляксей Багданаў.

«Пры распрацоўцы гэтых падыходаў доўга абмяркоўвалі тэму з імпарцёрамі і выпрацавалі сумесныя дзеянні. У прыватнасці, уводзіцца абавязак імпарцёра мець абгрунтаванне кантрактнай уваходнай цаны. У прынцыпе, гэтая працэдура ўжо многімі з іх праводзілася, — паведаміў ён. — Калі імпарцёр увозіў, напрыклад з Расійскай Федэрацыі, сланечнікавы алей, ён праводзіў даследаванні: браў 5—6 вытворцаў з Расіі, выбіраў найбольш выгадны варыянт і ў сябе захоўваў гэтыя звесткі. Гэта была неабавязковая працэдура, а цяпер з мэтай пацвярджэння абгрунтаванасці імпартнай цаны яе павінны будуць выконваць усе кампаніі, якія займаюцца ўвозам тавараў, вызначаных у пастанове».

Акрамя таго, Дзяржаўны мытны камітэт выбудуе сістэму маніторынгу такіх цэн і сумесна з МАРГ будзе ажыццяўляць кантроль, каб не дапусціць злоўжывання завышэння цаны імпартнага тавару.

Першы намеснік міністра Іван Вежнавец удакладніў, што абгрунтаванне кантрактнай цаны павінна захоўвацца ў імпарцёраў на папяровых носьбітах або ў электроннай форме.

«Гэта з'яўляецца абавязковай часткай эканамічнага абгрунтавання адпускной цаны. Такім чынам, у імпарцёра павінна быць абгрунтаванне да ўсяго ланцужка пастаўкі прадукцыі: кантрактная цана, мытныя плацяжы, выдаткі па дастаўцы тавару, абавязковае страхаванне, калі патрабуецца, іншыя выдаткі і надбаўка імпарцёра», — сказаў ён.

І. Вежнавец дадаў, што цяпер распрацоўваюцца рэгламенты адміністрацыйных працэдур. І адзін з дакументаў, які будзе ўтрымліваца ў патрабаваннях, — гэта маркетынгавае даследаванне, параўнанне цаны на аналагічныя тавары, якія выпускаюцца самім прадпрыемствам або іншымі суб'ектамі на рынку Беларусі. А таксама параўнанне цэн з экспартнай альтэрнатывай.

## Каб былі рэшткі салодкімі

«На рэшткі тавараў цэны павінны быць прыведзены суб'ектамі гаспадарання ў адпаведнасць з патрабаваннямі пастановы на працягу пяці рабочых дзён. І гэтай работай неабходна будзе заняцца ўжо цяпер», — сказаў Аляксей Багданаў.

«МАРГ як каардынатару неабходна будзе распрацаваць каля пяці рэгламентаў ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур і парадак дзеянняў па выкананні гэтай пастановы. Гэтую работу з учарашняга дня мы пачалі. Таму ўсе рэгламенты будуць выпушчаны ва ўстаноўлены тэрмін», — паведаміў міністр.

Па яго словах, з 1 студзеня ў краіне адмяняюцца бартарныя аперацыі. Акрамя выпадкаў знешнегандлёвых аперацый, аперацый паміж удзельнікамі холдынгаў, а таксама, калі такая здзелка будзе ўзгоднена з адпаведным дзяржаўным органам.

Таксама ўводзіцца забарона на выплату ўзнагароджанняў за прасоўванне прадукцыі ў рознічным гандлі, так званых бонусаў для пастаўшчыкоў айчыннай прадукцыі.

Што датычыцца аптовых арганізацый і гандлю, уводзіцца рэгуляванне ў сферы аптова-рознічных аперацый шляхам устанаўлення дыферэнцыраваных гранічных максімальных надбавак на пераліку спажывецкіх тавараў. «Такі від надбаўкі носіць сумешчаны характар, аб'ядноўвае аптовую і рознічную надбаўкі па-за залежнасці ад колькасці аптовых звёнаў. Такім чынам, мяркуецца, што неабгрунтаванае пасрэдніцтва будзе выключана», — сказаў Аляксей Багданаў.

## Паслугі на сваёй «хвалі»

Яшчэ міністр адзначыў, што паслугі не трапілі ў новую сістэму рэгулявання цэн. «Іх у пастанову ўрада № 713 не ўключалі па прычыне таго, што ў нашай краіне больш за 60 % паслуг ужо рэгулюецца дзеючым заканадаўствам. Напрыклад, гэта паслугі сувязі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, транспарту, адукацыі, рытуальныя паслугі і шэраг іншых».

## А Мінсельгасхарч абавязалі

Аляксей Багданаў паведаміў, што Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання па ўзгадненні з Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю ўстановіць гранічныя максімальныя цэны на шэраг тавараў, якія выкарыстоўваюцца ў перапрацоўцы. Гэта такія тавары, як малочка, свініна, буйная рагатая жывёла, некаторыя віды збожжавых, буракі, мука, масла, цукар і яйкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

У цэнтры ўвагі

# СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ — НА ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЛЛЁВЫХ УМОЎ

**Напрыканцы Тыдня бацькоўскай любові прайшоў круглы стол на тэму «Моцная сям'я — моцная дзяржава. Бацькоўскі дар»**

**У Храме-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны, напярэдадні Дня бацькі сабраліся прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства інфармацыі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, прадстаўнікі СМІ. На круглым стале ішла гаворка пра сямейную палітыку, традыцыйныя каштоўнасці ў свеце сучасных рэалій, пераемнасць пакаленняў у кантэксце бяспекі дзяржавы. Акрамя таго выступоўцы адзначылі важнасць факультатыўных заняткаў «Асновы сямейнага жыцця» для вучняў 9—11 класаў школ, а таксама адукацыі бацькоў у межах рэспубліканскага праекта «Бацькоўскі ўніверсітэт».**

«Сям'я — як клетачка: ад яе стану залежыць стан усяго арганізма — дзяржавы», — адзначыў **Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны.** Паводле яго слоў, 98 % насельніцтва нашай краіны лічыць сям'ю асноўнай часткай свайго жыцця. «Дзяржаўная палітыка накіравана на падтрымку сем'яў, у тым ліку і шматдзетных. Радуе, што колькасць апошніх вырасла на 70 % ва ўсіх рэгіёнах. Зараз іх 120 тысяч. Аднак у Міністэрства працы і сацыяльнай абароны паступае шмат зваротаў ад жанчын аб тым, што наймальнік не вельмі ахвотна дае ім выхадны дзень (сёння, згодна з нашым заканадаўствам, шматдзетныя маці маюць права на адзін дадатковы выхадны дзень у тыдзень. — **Аўт.**). Таму зараз разглядаецца пытанне, каб адзін вольны ад працы дзень замяніць на скарочаныя працоўныя дні — даць шматдзетнай маці магчымасць штодзень сыходзіць з работы на гадзіну раней. Мы лічым, што гэта будзе накіравана на дапамогу бацькам, якія выхоўваюць дзяцей».

Вельмі станоўча было ўспрынята і рашэнне аб датэрміновым распараджэнні сямейным капіталам у 2020—2022 гадах, у асноўным сем'і выкарыстоўваюць яго на паляпшэнне жыллёвых умоў. Акрамя таго, як адзначыў Валерый Кавалькоў, з 2021 года кожная шматдзетная сям'я, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, павінна быць накіравана на будаўніцтва жылля на працягу аднаго года з даты пастаноўкі на ўлік тых, хто мае патрэбу. Каб не было такога, што людзі атрымалі «квадратныя метры», калі дзеці ўжо выраслі. За 8 месяцаў гэтага года жыллём забяспечана 6,3 тысячы шматдзетных сем'яў.

Паводле слоў **намесніка міністра інфармацыі Ігара БУЗОЎСКАГА,** зараз вядзецца работа над праектам абноўленай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, у аснове якой ляжыць у тым ліку і пераемнасць пакаленняў, моцныя сямейныя традыцыі і каштоўнасці.

Пасля круглага стала адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава», які стаў ужо традыцыйным. На падставе рашэння журы дыпломы і грашовыя ўзнагароды ў памеры 11 базавых велічынь атрымалі 12 прадстаўнікоў рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі. Паводле слоў Ігара Бузоўскага, усяго на конкурс было прадстаўлена 135 работ ад 101 рэдакцыі СМІ. «Усе матэрыялы, пададзеныя на конкурс, настолькі цікавыя і карысныя, што іх можна і варта перачытваць».

Павіншаваў пераможцаў і творчы фальклорны калектыў «Мядоцкая талака». Артысты прывезлі з сабой не толькі песні, але і калекцыю вышытых ручнікоў трох пакаленняў сям'і Марыі Ціханаўны Абрамовіч, Ганаровага грамадзяніна Барысаўскага раёна, дэпутата Вярхоўнага савета СССР, ветэрана сельскай працы.

Шмат гаварылася і пра важнасць сямейнага чытання як аснову гарманічнага развіцця дзяцей. **Лілія АНАНІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,** падарыла старшыні ГА «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяне Краўчанцы і шматдзетным маці, якія прысутнічалі на круглым стале, зборнік выбраных твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа «Бацькоўскі дар», выдадзены ў межах праекта «Сямейнае чытанне». Кніга аздоблена цудоўнымі ілюстрацыямі фотакарэспандэнта «Звязды» Анатоля Клешчука.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

З нагоды

# БЫЦЬ БАЦЬКАМ — ВЯЛІКАЕ ШЧАСЦЕ

**Сёння ўсе таты Беларусі адзначаюць новае свята — Дзень бацькі. Моцныя і сур'ёзныя, яны нараўне з жанчынамі расплываюцца шчаслівымі ўсмешкамі ў абдымках родных ручак, абараняюць сваіх дзяцей ад нягод. Не ўсім выпадае шчасце бацькоўства, але асабліва шанцуе тым, у каго яно памножана на некалькі разоў.**

У светлым доме сям'і Мініных з Віцебскага раёна ніколі не бывае ціха: гамоняць старэйшыя Алена і Ангеліна, раздаецца тупат ножак двайнятак Машы і Дашы. Галава сямейства Аляксандр ласкава называе сваіх дзяўчатак «ружавым кветнікам», ды і як тут па-іншаму, калі ён — адзіны мужчына. Гісторыя кахання Аляксандра і Святланы пачалася сем гадоў таму, праз тры — ажаніліся, а яшчэ праз год у пары нарадзіліся двайняты.

Света і Саша мясцовыя, з Суража, доўга былі проста знаёмымі, а пасля сталі крок за крокам віць сямейнае гняздзечка. Ён працуе трактарыстам-машыністам агракомплексу імя М. П. Шмырова Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі, мае за плячыма багаты сельскагаспадарчы вопыт — больш 15 гадоў — і носіць пачэснае званне перадавіка, бо не раз станавіўся пераможцам раённых галіновых спаборніцтваў. Больш як 10 гадоў падчас уборачнай шчыраваў на камбайне, але змяніў кірунак дзейнасці — мужчыну больш падабаецца працэс падрыхтоўкі асновы пад будучы ўраджай, таму Аляксандр на энерганасычаным «Кіраўцы» задзейнічаны на земляробчых работах. А кола палявых сельскагаспадарчых работ амаль не спыняецца.

Святлана па спецыяльнасці кухар, некаторы час працавала ў Віцебску, потым вярнулася на малую радзіму і ўладкавалася ў мясцовую гаспадарку бухгалтарам, пасля перавялася на пасаду загадчыка склада: адпускала запчасткі для сельгастэхнікі, вяла дакументацыю. Пра тое, наколькі адказна ставіцца да работы, сведчыць яе клопат у дэкрэтным адпачынку: паспявала забягаць на склад і кансультаваць калег. Маладыя бацькі выхоўвалі двух дачок Ангеліну і Алену, дапамагалі ім і бабулі з дзядулямі. А калі Мініны вырашылі, што дзявоцкаму асяроддзю не хапае браціка, лёс распарадзіўся іначай і падарыў дзвюх дзяўчынак Машу і Дашу.

«Канешне, спачатку было цяжка спраўляцца з двайнятамі і старэйшымі дзецьмі, але муж падставіў моцнае плячо дапамогі. І падтрымліваў парадак у хаце, і суцяшаў двайнят, і гатаваў — даваў мне такія патрэбныя хвілінкі адпачынку. З упэўненасцю магу сказаць, што я за ім як за каменнай сцяной», — расказвае Святлана.

Маша і Даша, як найкаштоўнейшыя падарункі бацьку, нарадзіліся амаль на Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі — 18 лістапада. Зараз ім амаль тры, яны нядаўна сталі наведваць дзіцячы садок. Вельмі падобныя знешне, але зусім розныя па характары: Марыя — старэйшая ўсяго на адну хвілінку — занадта сур'ёзная, а Дар'я гарэзлівая і любіць усміхацца. Але бацькоўскія сонейкі ўжо ў такім маленькім узросце абараняюць адна адну і падтрымліваюць. Старэйшай Ангеліне шаснаццаць, яна заканчвае школу з юрыдычным ухілам і плануе паступаць у Віцебск. Алене дванаццаць, яна вучыцца ў сёмым класе Суражскай сярэдняй школы, а ў вольны час займаецца вышыўкай і маляваннем.

Шматдзетны тата Аляксандр называе сябе самым шчаслівым чалавекам і ў першую чаргу заўсёды расказвае не аб сваіх справах, а аб дасягненнях чатырох дочак. Як на крылах, спяшаецца пасля цяжкага працоўнага дня дадому, дзе яго любяць і чакаюць. Калі ўдаецца правесці выхадны дзень з сям'ёй, то ўсе хатнія справы робяць разам. Асабліва падабаецца малым з татам у трактары, а яшчэ — дапамагаць маці на градках, паліць з дзядулем лазню, назіраць за тым, як забраныя імі ў садзе яблыкі і грушы з-пад лёгкай мамінай рукі выходзяць у форме павідла і кампотаў.

Падчас тыдня бацькоўскай любові, які фінішаваў у Дзень бацькі, з цёплымі віншаваннямі да Мініных завітала старшыня Віцебскага раённага камітэта прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Таццяна Дзіканава. «Быць бацькамі — найвялікшае шчасце і цяжкая штодзённая праца, з якой вы ўзорна спраўляецеся. Вялікі дзякуй за важкі ўклад вашай сям'і ў развіццё сельскай гаспадаркі раёна і выхаванне дзяцей — светлай будучыні нашай краіны. Жадаю вашаму дому дабрабыту, гармоніі і новых дасягненняў», — павіншавала прафсаюзны лідар аграрыяў раёна і ўручыла Мініным салодкі падарунак і сокавыціскалку.

Галаву сямейства Аляксандра дома не засталі — ён, як і заўсёды, барозніць бязмежныя падзвінскія палі, не губляючы апошніх пагодлівых хвілін. Але ўвечары дружная сям'я збярэцца за вялікім сталом, і дзяўчаткі скажуць бацьку запаветнае «дзякуй, за тое, што ты ёсць». А для простага мужчынскага шчасця большага не трэба.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 22 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ.Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Таццяна Мікалаеўна ШАЎЦОВА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея Анатолеўна ЛАЗАРЭВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Ліз Трас аб'явіла аб адстаўцы

**Аб сваёй адстаўцы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Ліз Трас аб'явіла падчас выступлення перад сваёй рэзідэнцыяй на Даўнінг-стрыт, перадае тэлеканал Sky News.**

«Я не магу выконваць паўнамоцтвы, якія былі мне дадзены Кансерватыўнай партыяй. Па гэтай прычыне я размаўляла з Яго Вялікасцю каралём Карлам III, каб апавясціць, што я падаю ў адстаўку», — сказала яна.

Пры гэтым, паводле яе слоў, яна застанецца на пасадзе да таго часу, пакуль не будзе абраны новы лідар Кансерватыўнай партыі. Выбары пройдуць на наступным тыдні, дадала Трас.

Заява Трас адбылася адразу пасля сустрэчы са старшынёй «Камітэта 1922» Грэмам Брэйдзі, які прадстаўляе парламенцкую фракцыю Кансерватыўнай партыі. Па даных брытанскіх СМІ, падчас сустрэч Грэм паведаміў Трас, што яна больш не можа разлічваць на падтрымку большасці членаў парламента ад Кансерватыўнай партыі.

Ліз Трас прабыла на пасадзе прэм'ер-міністра 45 дзён, меўшы, такім чынам, самы кароткі тэрмін на гэтай пасадзе ў гісторыі Вялікабрытаніі. Да гэтага антырэкорд належаў Джорджу Канінгу, які памёр у 1827 годзе на 119-м дні праўлення.

## МЗС РФ папярэдзіла Захад аб пераходзе чырвонай рысы ў адносінах з Расіяй

**Афіцыйны прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Расіі Марыя Захарава падчас брыфінгу заявіла, што заходнія краіны на фоне паставак імі ўзбраення Украіне набліжаюцца да небяспечнай рысы прамога ваеннага сутыкнення з РФ. Пра гэта паведамляе «РІА Навіны».**

«Краіны НАТА, нібы спаборнічаючы адна з адной, працягваюць напампоўваць кіеўскі рэжым узбраеннямі, боепрыпасамі, пастаўляць яму разведданыя, навучаць салдат, даваць арыенціроўкі па вядзенні баявых дзеянняў», — адзначыла яна.

Па словах дыпламата, сумарная ваенная дапамога заходніх дзяржаў Кіеву складае ўжо $42,3 млрд, з іх, падкрэсліла Захарава, больш за палову прыпадае на Злучаныя Штаты.

«Краіны, якія выдзяляюць такія вялізныя грошы і пастаўляюць узбраенні кіеўскаму рэжыму, з'яўляюцца донарамі, спонсарамі гэтай самай экстрэмісцкай дзейнасці», — указала прадстаўнік расійскага ведамства.

## Паліва ў Еўропе патаннела на фоне закупак ЗПГ і запаўнення газавых сховішчаў

**Цэны на газ у Еўропе працягваюць зніжацца з-за актыўных паставак звадкаванага прыроднага газу і высокага ўзроўню запаўняльнасці газавых сховішчаў напярэдадні зімовага ацяпляльнага сезона. Гэтыя фактары стварылі адносны лішак прапановы, паведамляе «Коммерсант».**

«Ф'ючарсы на газ стабілізаваліся, кошт на лістапад пакуль устанавіўся на ўзроўні каля $1,3 тысячы за 1 тысячу кубаметраў. На споставым рынку кошт газу «на суткі наперад» працягвае падаць і ўжо дасягае $645 за 1 тысячу кубаметраў», — гаворыцца ў матэрыяле.

Змякчэнню росту біржавых цэн на газ таксама будзе садзейнічаць адносна цёплае надвор'е ў кастрычніку на тэрыторыі краін Еўрасаюза. У той жа час кампенсаваць рэзкае скарачэнне паставак расійскага газу дазваляе высокая актыўнасць танкераў са звадкаваным прыродным газам у партах паўднёваеўрапейскіх краін.

Таксама па выніках трэцяга квартала ўзровень спажывання газу ў ЕС скараціўся прыкладна на 10 %, да 65,6 млрд кубаметраў. Імпарт ЗПГ за названы час, наадварот, рэзка вырас — на 103 %, да 27 млн тон.

Разам

# РАБІЦЬ ГІСТОРЫЮ ДАСТУПНАЙ

**Да 100-годдзя дзяржаўнай архіўнай службы Беларусі сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» сумесна з Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь у праекце «Навіны культуры» запускае серыю інтэрв'ю з навуковымі супрацоўнікамі архіўных устаноў.**

Сёння ў краіне дзейнічаюць 157 архіўных устаноў, што забяспечваюць захаванасць, улік і выкарыстанне дакументаў, большая частка з якіх увахо-дзіць у склад Нацыянальнага архіўнага фонду. Зараз у яго супрацоўнікаў і магчымасцяў больш, і задач.

— Справа архівістаў — не толькі захоўваць, але і ажыў-ляць гісторыю, рабіць яе да-ступнай і зразумелай для ўсіх, — расказвае **аўтар і вядучая «Навін культуры» Ганна ПАНЦЯЛЕЕВА.** — Дарэчы, на афіцыйным сайце Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь размешчаны шэраг праектаў, прымеркаваных да юбілейнага для архівістаў года і Года гістарычнай памяці. У нашай праграме мы штотыднёва будзем расказваць пра гэтыя праекты, а таксама пра фонды і людзей, якія захоўваюць і ствараюць дакументальна-гістарычны летапіс Беларусі.

А даведацца больш пра такія дакументальныя праекты, як «Без тэрміну даўнасці», «Мінскае гета», «Перасяленцы з БССР», інтэрнэт-партал «Партызаны Беларусі» і іншыя, гледачы цяпер змогуць з першых вуснаў у эфіры тэлеканала «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 157

**Сваю новую задачу даслаў нам Мікалай Быкаў з вёскі Рэпічы Баранавіцкага раёна *(гл. дыяграму)*.**

**Белыя:** Крe8, Фа6, Лс4, Cd8, Се6, Kf5, пп. b6, b7, c5, e7 (10).

**Чорныя:** Крс6, Лb8, Kb5 (3).

**Мат за 2 хады.**

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

У Брэсце прайшлі першынствы Беларусі сярод юнакоў і дзяўчат да 12, 14 і 16 гадоў па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы. Вось хто заняў прызавыя месцы ў бліцы:

юнакі да 12 гадоў — 1. Радзівон Сідарэня (Баранавічы); 2. Дзмітрый Макарэвіч (Брэст); 3. Мікіта Мазанік (Мінск);

юнакі да 14 гадоў — 1. Цімур Гвоздзеў (Магілёў); 2. Аляксандр Дзяркач (Гомель); 3. Сяргей Барысчык (Мінск);

юнакі да 16 гадоў — 1. Міхей Навуменка (Орша); 2. Арцём Сіняўскі (Мінск); 3. Ягор Сіліч (Віцебск);

дзяўчаты да 12 гадоў — 1. Кацярына Зубкоўская (Мінск); 2. Ганна Сапрыкава (Віцебск); 3. Яна Дэльнік (Мінск);

дзяўчаты да 14 гадоў — 1. Юлія Лявонава (Гомель); 2. Марыя Баравікова (Мінск); 3. Ніка Венская (Мінск);

дзяўчаты да 16 гадоў — 1. Аляксандра Тарасенка (Брэст); 2. Ксенія Норман (Гродна); 3. Аляксандра Шабан (Кобрын).

А вось прызавыя тройкі ў рапідзе:

юнакі да 12 гадоў — 1. Сяргей Чыслоў (Мінск); 2. Захар Емяльянаў (Вілейка); 3. Матвей Савельеў (Мінск);

юнакі да 14 гадоў — 1. Арцём Бяляўскі; 2. Андрэй Руднеў; 3. Сяргей Барысчык (усе — Мінск);

юнакі да 16 гадоў — 1. Арцём Сіняўскі (Мінск); 2. Міхей Навуменка (Орша); 3. Платон Клачкоў (Рагачоў);

дзяўчаты да 12 гадоў — 1. Кацярына Зубкоўская (Мінск); 2. Вераніка Абрамкіна (Магілёў); 3. Дарыя Скамарошчанка (Брэст);

дзяўчаты да 14 гадоў — 1. Юлія Лявонава (Гомель); 2. Маргарыта Бендзік (Магілёў); 3. Мілена Сідарэня (Баранавічы);

дзяўчаты да 16 гадоў — 1. Аляксандра Тарасенка (Брэст); 2. Ксенія Норман (Гродна); 3. Аляксандра Шабан (Кобрын).

* * *

У Рагачове прызавую тройку адкрытага турніру (49 гульцоў) склалі Міхей Навуменка, Юлія Лявонава і Ксенія Норман. У майстроўскім турніры (10 удзельнікаў, у тым ліку 4 міжнародныя майстры і 2 майстры ФІДЭ) перамог майстар ФІДЭ Ілья Грыгор'еў, на другім месцы Максім Гаўрылаў, на трэцім — міжнародны майстар Раман Грыб. У турніры па бліцы (42 гульцы) першыя тры месцы занялі адпаведна Міхей Навуменка, Сяргей Барысчык і Яраслаў Навумовіч.

У двух турнірах па бліцы на сайце chess.com (459 і 368 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік заняў адпаведна 7-е і 13-е месцы, а Сяргей Жыгалка — 19-е і 30-е. Яшчэ ў двух такіх турнірах Д. Лазавік быў пяты з 427 гульцоў і дваццаць першы з 350.

* * *

Задача А. Варыцкага з мінулага выпуску рашаецца 1. Лb2, задача С. Дарошчанкі — 1. Крe3. Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Дарошчанка, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ЧЫТАЙЦЕ Ў ЧАСОПІСЕ «АЛЕСЯ» Ў КАСТРЫЧНІКУ

## «Калі бацькі думаюць, што «дзіцяці цяжка», то потым цяжка будзе ім»

«Важна, каб бацькі не баяліся размаўляць са сваім дзіцём на ўсе тэмы, якія лічаць актуальнымі. Бацькі павінны сфарміраваць са сваім дзіцём даверлівыя адносіны да таго, як, напрыклад, яно даведаецца, што такое наркотыкі і якімі спосабамі на іх можна зарабіць грошы», — упэўненая Вольга Чамаданава. Аб сваім бачанні сучаснай моладзі, аб розных праектах маладых і для маладых, а таксама правілах выхавання дзяцей у сваёй сям'і расказала начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама, старшыня Мінскай гарадской арганізацыі БСЖ Вольга Чамаданава.

